ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ
ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА І МЕНСКАГА КОМІТЭТАЎ ЛЕНІНСКАГА КОМУНІСТЫЧНАГА САЮЗУ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

№ 127 (509) Аўторак, 15 лістапада 1927 г. | Выходзіць тры разы на тыдню у аўторак, чацьвер і суботу | Год выд. VII. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. Тэл. № 903. | Адрас рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена": Менск, Комсам. 25.

ЛЕС РУК ЗА ЛІНІЮ ЛЕНІНСКАГА ЦК.

КОМСАМОЛ НЕПРЫМІРЫМЫ ВОРАГ ТРОЦКІЗМУ.

СТАЛЁВАЙ СЬЦЯНОЮ ВАКОЛ ЛЕНІНСКАГА ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТУ. РАСКОЛЬНІКАМ НЯ МЕСЦА Ў ПАРТЫІ І КОМСАМОЛЕ.

За бальшавізм, за ЦК!

Сход комсамольскага актыву адразу рашуча і беспаваротна выжыў усе, набіўшыя аскому, організацыйныя недахопы.

— Акуратнасьць.

— Сваечасовая яўка.

— Нязвычайняя ўважлівасьць, нейкая асаблівая, чулая настарожанасьць—вось характэрныя рыскі сходу комсамольскага актыву.

На сходзе—600 чалавек. Агромністая заля клюбу Карла Маркса патанула ў хвалюючайся ніве галоў, і ня гледзячы на шматлюднасьць, адчувалася нейкая неперадаваемая спайка, жаданьне навочна паказаць, што «усе за аднаго, адзін за ўсіх» у справе барацьбы за партыю, за яе ленінскую політыку.

Тое нязвычайна-цёплае, любоўнае, ад душы, ад сэрца шчырае спатканьне, якое ўчыніў сход сакратару ЦК КП(б)Б тав. Кнорыну, тая бура воплескаў, якая доўгія хвіліны ня сьціхала ў гонар прадстаўніка ленінскага ЦК УсеКП(б)Б—тав. Уншліхта—усё гэта жыва аднавіла ў памяці незапамятныя, хвалюючыя малюнкі сходаў 18-19 гадоў.

Так, якраз малюнкі гэтых гадоў, калі ў моманты найсуровых небясьпек комсамол грудзьмі ўставаў на абарону краіны, абарону партыі.

І цяпер, у 1927 годзе, у момант ярасных нападкаў опозіцыі на партыю—комсамол, яго актыў грудзьмі, якраз грудзьмі, сталёвай сьцяною стаў на абарону ленінскай партыі, бальшавіцкага ЦК.

Гэты сход глыбокім рубцом адзначыўся ў памяці ўсіх прысутных, ён проста, пераканаўча і разам з тым ярка паказаў, з кім комсамол, пад чым кіраўніцтвам ён змагаўся і прыдзе да перамогі.

* * *

Але на сходзе адчуваўся ня толькі энтузіязм, але, галоўнае для нас, адчувалася падрыхтоўка, уменьне па ленінску разабрацца ў пытаньнях, «раскусіць» опозіцыйныя выкруты.

Сходам Менскага актыву пачынаецца абгаварваньне пытаньняў XV партзьезду ў гарадзкіх ячэйках і растлумачальная праца ў вясковых організацыях.

І мы цьвёрда перакананы, што комсамол Беларусі, разам з усім ленінскім комсамолам СССР на дэзорганізатарскія, антыленінскія вылазкі опозіцыі адкажа словамі аднаго з выступіўшых на актыве прамоўцаў:

— Досыць. Кропка.

На гарадзкім сходзе актыву Менскай комсамольскай організацыі.

На сход актыву комсамольскай організацыі гор. Менску, які адбыўся 13-га лістапада, зьявілася 600 чал. Вялікая заля клюбу Карла Маркса была перапоўнена да адказу рабочымі кожанкамі, хусткамі работніц, чырвонаармейскімі шынэлямі.

З дакладам аб надыходзячым 15-ым партзьезьдзе і задачах комсамолу, выступіў сакратар ЦК КП(б)Б **т. Васілевіч**.

У кароткіх і яскравых рысах дакладчык пазнаёміў сход з тым становішчам Саюзу Савецкіх Рэспублік, як унутравога, так і міжнароднага характару, з якім наша партыя прышла к сваіму 15-му зьезду.

Комсамольскі актыў з вялікай напружанасьцю слухаў даклад, уважліва лавіў кожнае слова, якія паказалі далейшыя задачы краіны дыктатуры пролетарыяту, пралівалі сьвятло на тыя перашкоды, якія могуць спаткаць нас на шляху выконваньня стаячых перад намі задач. З асаблівай увагай слухалі таварышы, калі тав. Васілевіч пачаў паведамляць «каляндарна» аб дзеяньнях опозіцыі на працягу апошніх двух месяцаў. **Факты ўтварэньня падпольных саматужных друкарняў, збліжэньне опозіцыі з чужымі нам элемэнтамі, з ворагамі справы рабочых, супроцьсавецкія выступленьні ў Маскве і Ленінградзе, калі мільёны пролетарыяту сьвяткавалі першае дзесяцігодзьдзе сваё дыктатуры...**

Яшчэ даклад ня скончыўся, а ў прэзыдыум конвэерам жывых рук перадаваліся дзесяткі запісак, у большасьці якіх чорным па беламу значылася: «**Прашу слова**»...

Балбатні ня слухаем.

У спрэчках першае слова атрымаў малады рабочы заводу «Энэргія» тав **Гуманаў**. Ён фактамі **паляпшэньня матар'яльнага становішча рабочай моладзі на сваім заводзе, павышэньня яе кваліфікацыі, павялічэньня колькасьці броні** разьбіваў паклёпы комсамольскай опозіцыі аб тым, што, быццам бы **комсамол здаў свае Кастрычнікавыя заваёвы, што рабочая моладзь выціскаецца з прамысловасьці і г. д.**

— Опозіцыя і ў партыі і комсамоле, —кажа далей т. Гуманаў,—далёка вышла за тыя законныя рамкі абароны сваіх поглядаў, якія вызначаны статутам УсеКП. Гэта можна лішні раз пацьвердзіць фактам, які меў месца на нашым заводзе.

Як опозіцыя агітавала... 12-ці гадовага піонэра.

— Дванаццацігадовы хлопчык—піонэр прыходзіць на завод і пачынае гаварыць на партыю ўсё тое, што выходзіць вялізарнай лавінай з брудных вуснаў лідэраў опозіцыі, а іменна: у партыі зажым, арышты, партыя выкідае з сваіх шэрагаў лепшых бальшавікоў—ленінцаў і г.д. Калі пачалі ў яго распытваць, адкуль ён аб усім гэтым даведаўся, дык дазналіся, што нейкі опозіцыянэр, які на пару дзён прыяжджаў з Масквы ў Менск, сабраў некалькі піонэраў, разводзіў перад імі паклёпы на партыю, заклікаў «масы» на барацьбу з ленінскім ЦК (з месц чутны моцныя выкрыкі: **ганьба бяспрытомнай опозіцыі, -няхай жыве партыя Леніна!**).

Пад дружныя воплескі і выкрыкі—«правільна,», тав. Гуманаў сваё выступленьне канчае наступнымі словамі.

— На нашым сходзе ёсьць горапозіцыянэры (у залі сьмех), якія будуць выступаць і апавядаць вядомыя ўсім казкі. Прапаную выслухоўваць толькі справу, а за балбатню —гнаць з трыбуны!

Тэзісы ЦК УсеКП(б) і „контр-тэзісы"... Нахамкіна.

З ахапкам артыкулаў і прамоў Троцкага, Зіноўева, Сьмілгі, Прэабражэнскага, з выглядам вялікага чалавека, які толькі адзін можа вырашыць пытаньні, што паўсталі перад партыяй, выходзіць на трыбуну вядомы актыву менскай організацыі опозіцыянэр Нахамкін. З месцаў чутны выкрыкі:

— Нахамкін! гавары справу, бо інакш патурым з трыбуны.

Спачатку опозіцыянэр выдаў свой сакрэт—паведаміў, што хоча адкінуць усе зацьверджаньні, якія рабіліся дакладчыкам. Заля настаражылася... Але раней, чым зрабіць гэта, Нахамкін узяўся апавядаць аб выступленьні опозіцыі ў Маскве на кастрычнікавай дэмонстрацыі, дзе ён **«сам быў, удзельнічаў, і ўсё бачыў»**. Кожнае слова прамоўцы, накіраванае ў абарону Троцкага і Зіноў'ева, як сапраўдных «правадыроў пролетарыяту ўсяго сьвету», пакрывалася сьмехам і выкрыкамі:

— Можа і ты ў правадыры мециш?

— Многа інструкцый з Масквы прывёз?

АБ ЧЫМ КАЗАЛІ ТАВАРЫШЫ Ў СПРЭЧКАХ.

Нахамкін і барацьба „некіх" двух сыстэм.

«Адкідаючы» задачы УсеКП і комсамолу, аб якіх тав. Васілевіч гаварыў у сваім дакладзе, опозіцыянэр Нахамкін спыніўся на барацьбе нейкіх дзьвёх сыстэм у вёсцы, аб якіх, як паказала само выступленьне, Нахамкін ня мае ні малейшага разуменьня.

Калі старшыня сходу званком паведаміў прамоўцу аб сканчэньні яго часу, апошні сур'ёзна заявіў:

— **Цяпер па сутнасьці справы.**

Заля загучэла сьмехам і скрыпам крэслаў. Несьліся выкрыкі:—**Дык ты-ж нічога не сказаў!—Бедны Нахамкін! —Ідзі лепш пачытай політграмату Вірганскага!**

Старшыня сходу тав. Красоўскі прапануе працягнуць час прамоўцу.

Мыльныя пузыры і опозіцыя.

Пятровіч (шкляная гута).

Тав. Пятровіч просіць у прысутных выбачэньня, што магчыма ён будзе гаварыць ня так складна. Ён—гэта **прыбыўшы комсамолец з-за кардону**, які тут у нас—у эсэсэры **ліквідаваў сваю няпісьменнасьць**, пачынае гаварыць прамову пад бурныя воплескі комсамольскага актыву:

— Опозіцыянэры ў комсамоле—гэта тыя дзеці, якія пускаюць у паветра мыльныя пузыры. Троцкі і Зіноў'еў пусьцяць пузыр, а яны радуюцца і сьмяюцца.

Паведаміўшы, што на іх заводзе 110 чалавек рабочай моладзі—у комсамольскай ячэйцы, што ім дазволіла парт'ячэйка ўдзельнічаць у дыскусіі, што яны глыбока прапрацавалі матар'ялы да зьезду партыі і ўсе **рабочыя адзінадушна ганьбяць паклёпы комсамольскай опозіцыі аб тым, што рабочая моладзь выціскаецца з прамысловасьці, што рабочыя пойдуць за опозіцыяй.**

— **Нам трэба,** — кажа ў канцы тав. Пятровіч,—**павялічыць культурны ўзровень рабочай моладзі. Нам трэба павялічыць кваліфікацыю рабочай моладзі. Нам трэба рыхтаваць зьмену партыі. І ўсяму гэтаму перашкаджае опозіцыя.** Гнаць яе трэба вон, мы ня хочам балбатні, мы хочам **сур'ёзнай працы!**

„Ты з намі—ці супроць Леніна?"

Тав. **Ратнэр** (ЦК ЛКСМБ), падзяліўшыся сваім «задаволеньнем», што слухае Нахамкіна другі раз, застанавіўся на словах гэтага опозіцыянэра, якія ён выказаў на сходзе парт'ячэйкі Меншвею: **«пытаньні, якія стаяць сёньня перад партыяй — у рамках партыі разьвязаць нельга. Спрэчкі будзе вырашаць рабочая к яса».**

Што гэта значыць? Гэта значыць тое, да чаго ўжо опозіцыя і дакацілася: **дружба з чужымі нам элемэнтамі, дружба з контр-рэволюцыянэрамі, організацыі другой партыі і шэраг іншых антыпартыйных мерапрыемстваў.** Нахамкін быў у Маскве. Ён больш за іншых зьвязан з опозіцыяй. Нам трэба сёньня паставіць пытаньне перад Нахамкіным—**ты з намі, з комсамолам, з Ленінскай партыяй—ці супроць Леніна, супроць яго партыі?**

І з гэтага рабіць вывад аб далейшым прабываньні Нахамкіных у шэрагах Ленінскага Комсамолу.



Той, каму сьніцца ППС.

У шынэлі з шырокімі рукавамі, з блёк-нотам, сьпісаным «патрэбнымі» вытрымкамі,—выходзіць на трыбуну другі комсамольскі опозіцыянэр Менску—**Канеўскі.**

Абвёўшы залю поглядам, Канеўскі выказаў сваё пажаданьне: **Не хачу бачыць сход актыву ў ролі пэпэсаўцаў, якія працуюць у Польшчы.**

Адзін напамін пэпэс, і параўнаньне гэтай здрадніцкай партыі з нашым ленінскім комсамолам вызвала вялікае абурэньне актыву. Дзесяткамі галасоў вы крыківаліся прапановы: **далоў Канеўскага! Ня даць яму гаварыць! Пэпэсаўцам—ня месца ў шэрагах комсамолу!**

Пакрычалі, пасьмяяліся з Канеўскага, а ўсё-ж такі парашылі выслухаць.

Канеўскі пачаў лішні раз паўтараць хлусьню правадыроў опозіцыі аб тым, што тысячы лепшых працаўнікоў арыштоўваюцца, што старыя бальшавікі сядзяць у ДПУ (з месц нясуцца Канеўскаму запытаньні: факты дай, факты) Потым гэты «славуты» опозіцыянэр адчыніў Амэрыку: **у партыі ёсьць фракцыйная праца. Гэта дрэнна. Але хто да гэтага давёў?**

—! Такія бязглуздыя людзі, як Канеўскія!—нясецца з месц.

Нешта хацеў яшчэ сказаць прамоўца, але званок апавясьціў аб сканчэньні часу, і заля са сьвістам правяла Канеўскага з трыбуны.

Прамова тав. Уншліхта.

На сход актыву Менскай організацыі комсамолу прышоў намесьнік старшыні Рэўваенсавету тав. **Уншліхт**. Пад бурныя воплескі і выкрыкі: **няхай жыве Чырвоная армія!**—тав. Уншліхт абіраецца ў прэзыдыум. Яшчэ большымі воплескамі і авацыяй спаткалі комсамольцы прамову тав. Уншліхта:

— Наш комсамол—ленінская зьмена партыі. Прад комсамолам стаяць вялізарнейшыя задачы—выхаваць, загартаваць маладое пакаленьне да прадстаячых боек. Опозіцыя хоча прыцягнуць на свой бок моладзь. З гэтай мэтай яна выдумвае розныя паклёпы, што комсамол здае кастрычнікавыя заваёвы, выказвае думкі аб пагоршаньні матар'яльнага становішча рабочай моладзі. Мы ведаем, што за опозіцыяй пашла толькі дэклясаваная моладзь.

Опозіцыя з плачам крычыць, што яе крыўдзяць, яе б'юць. А калі Зіноўеў, Троцкі і Каменеў ня лічацца з партыяй, вялізарнай лавінай выліваюць паклёпы на Ленінскую партыю,—гэта што значыць? Таму мы і гаворым, калі вы лічыцеся з партыяй, павінны падчыніцца яе волі і кропка (Апладысмэнты і выкрыкі).

Выступаўшыя тут опозіцыянэры паставілі сябе па-за комсамолам, па-за партыяй, па-за рабочай клясай. Опозіцыя ўвесь час крычыць: хіба можна выключаць з партыі людзей з такімі заслугамі перад рабочай клясай? Але, таварышы, заслугі Троцкага і Зіноўева **робяцца нікчэмнымі** перад тым, што яны зрабілі ў апошні час у шкоду партыі. У партыі больш мільёну загартаваных бальшавікоў. Партыя праверыла сваю лінію многімі гадамі цяжкай працы. І цяпер партыя з пераконанасьцю гаворыць: опозіцыі патрэбна балбатня, а нам—партыі—справа! (Усе ўстаюць. Бурныя воплескі).

* * *

Пасьля тав. **Уншліхта** выступіў яшчэ адзін опозіцыянэр—нехта **Савіцкі**. Ён хацеў гаварыць супроць слоў **Уншліхта** аб выключэньні Троцкага і Зіноўева з партыі гаворачы, што трэба зьняць Сталіна, але заля, учуўшы падобныя рэчы, крыкамі і сьвістам супыніла прамоўцу. Галасавалі і ўхвалілі—не ага пахлёпы слухаць. Няма часу.

„Не атрымаеце ніводнага чалавека".

Тав. Бараньнікаў, спатканы актывам дружнымі воплескамі, зьвярнуўся да актыву з просьбай—**даваць усім таварышам гаварыць**, бо гэта опозіцыя **скарыстоўвае ў сваёй брахні на партыю**, што яе прыціскаюць, што ёй не даюць гаварыць.



Тав. Уншхліхт.

— Перад 15 партыйнай конфэрэнцыяй у гэтай самай залі, мы чулі гэтых самых опозіцыянэраў. Тады да іх мы былі крыху «ласкавымі». Сёньня „ласкам" месца быць не павінна. **Тых, хто абзывае ленінскі комсамол пэпэсам—мы мігам выдварым з нашых шэрагаў. Пэпэсаўскага сьмецьця нам непатрэбна.** (Дружныя воплескі).

Нехта з опозіцыянэраў кінуў рэпліку: **няма ў саюзе дэмократыі.**

— А гэта не дэмократыя, — адказвае тав. Бараньнікаў—калі шэсьцьсот чалавек не даюць гаварыць опозіцыянэру Савіцкаму. (Сьмех. Галасы: правільна).

Цэнтральны камітэт комсамолу парашыў прыцягнуць комсамольскую організацыю да абгаварваньня задач, якія стаяць перад партыяй. Калі гэту пастанову рабілі, мы былі перакананы, што комсамольскія масы выступяць, як сёньня наш актыў, аддана партыі, яе ЦК. **Мы ўсе—за лінію Ленінскай партыі; дзе партыя —там і мы!** (Воплескі).

Далей тав. Бараньнікаў гаворыць, што комсамольская організацыя **нэйтральнай быць ня можа**, што яна прыме ўдзел у абгаварэньні хвалюючых партыю пытаньняў, але **опозіцыя ніколі не атрымоўвала і не атрымае** (Дружныя воплескі) **ніводнага нашага комсамольца.** Застанавіўшыся на працы моладзі, на зарбочай плаце, на павялічэньні броні, тав. Бараньнікаў канчае сваю прамову, зьвяртаючыся да опозіцыі:

— Ніводнага чалавека з Ленінскага комсамолу, ніводнага чалавека з рабочай моладзі вы не атрымаеце, бо комсамол хоча ўдзельнічаць у будаўніцтве соцыялізму толькі пад кіраўніцтвам Ленінскай партыі.

Комсамол—верны сын партыі.

Тав. Ланда.

Яму комсамольскі актыў наладжвае працяжную авацыю. Калі заля сьціхла, калі выкрыкі—вітаньне Чырвонай арміі, —змоўклі, тав. Ланда спакойна пачаў сваю прамову:

— Комсамол—найлепшы друг Чырвонай арміі. 25 проц. складу арміі—комсамольцы. Чырвоная армія — гэта комсамольская армія (працяжныя апладысмэнты). Вось чаму комсамольская організацыя так цікавіцца ўсім тым, што робіцца ў Чырвонай арміі.

Партыя высунула перад намі за апошні час шэраг сур'ёзных проблем. Іх комсамол сур'ёзна вывучыць, скажа свой погляд. Толькі політычныя сьляпцы ня бачаць таго, што робіцца ў нашай партыі, таго, як рабочая кляса асуджвае дзеяньні опозіцыі, ня бачыць таго, як рабочая, кляса тысячамі ўліваючыся ў шэрагі партыі, гэтым самым клейміць опозіцыю, адмяжоўваецца ад яе.

Вінаватых б'юць.

Так сказана даўно. І ўсіх опозіцыянэраў — усіх тых, хто падрывае нам працу—варта біць. Хто любіць сваю партыю,—той будзе да апошняй кроплі сваей крыві абараняць яе лінію.

Комсамол не адстане ад партыі. Комсамол—верны сын партыі Леніна (бурныя воплескі).

(Працяг глядзі на 2-ой стар.).

Комсамол стаяў і будзе стаяць на ленінскіх позіцыях!

Комсамол быў і будзе магутным памоцнікам бальшавіцкай партыі.

Сумесна з партыяй, пад яе кіраўніцтвам—да далейшых перамог.

На сходзе менскага актыву.

(Працяг. Пачатак глядзі на 1-ай стар.).

Мы з партыяй.

Як паявіўся генэральны сакратар ЦК КП(б)Б на трыбуне, комсамольскі актыў стаў і на працягу некалькіх хвілін аплёдыраваў, выкрыкваў—мы з партыяй, няхай жыве партыя Леніна, не дазволім парушаць дысцыпліну Ленінскую.

— Я вельмі шкадую, — **кажа тав. Кнорын**,—што ня мог выслухаць усіх прамоў опозіцыянэраў. Але выступаўшыя таварышы за опозіцыю мне вядомы.

Хто такі Канеўскі?

Гэта той, які, ня будучы ў нашай партыі, вёў супроць партыі раскольніцкую працу, які вазіў опозіцыйную літаратуру ў Сьвярдлоўск, які мае шмат іншых опозіцыйных «заслуг», які ў Менску стараўся наладзіць опэрацыйную сувязь. І гэты чалавек сёньня асьмельваецца параўноўваць наш комсамол з пэпэсам. Вось чаму мы Канеўскаму і кажам: вон з нашых шэрагаў, ідзеце назад сабе да пэпэсаўцаў (бурныя воплескі).

Хто такі Нахамкін?

Гэта той чалавек, які патрабуе выносіць партыйныя сакрэты на вуліцу для разьвязаньня іх абывацелямі. А такі чалавек ня можа быць і ў партыі і ў комсамоле.

Опозіцыя здрадзіць Кастрычнікавай рэволюцыі, УсеКП, Леніну, Комінтэрну. І ўсе тыя, хто асьмельваецца падтрымліваць опозіцыю—робіцца здраднікам ленінскага вучэньня. Для рабочай клясы патрэбна адна партыя. Гэтай партыяй і зьяўляецца партыя Леніна—УсеКП. Двух партый быць ня можа.

Правадыром партыі, правадыром рабочай клясы можа быць той, хто выконвае ленінскае вучэньне.

Той, хто адышоў ад партыі Леніна—ня можа быць правадыром. У гісторыі рэволюцыйнага руху вядомы факты, калі правадыры здрадзілі партыі, рабочай клясе. Прыкладам гэтаму можа служыць Пляханаў. І калі Пляханаў, здрадзіўшы рабочай клясе, адышоў ад партыі—ён не знайшоў ні малейшага падтрыманьня.

Паведаміўшы некалькі фактаў аб тым, як опозіцыя паскудзіць нам у міжнародных справах, як яна організоўвае за межамі цэнтр барацьбы супроць УсеКП, пад бурныя воплескі і выкрыкі адабрэньня, тав. Кнорын канчае сваё выступленьне наступнымі словамі:

— Сотні і тысячы рабочых, што ўліваюцца ў партыю, займуць месца ў нашых шэрагах. Думаю, комсамол, таксама дасьць партыі нямала верных, адданых справе рабочых, бальшавікоў. Пад сьцягам ленінізму, пад кіраўніцтвам партыі Леніна мы пабудуем соцыялізм.

Прымаюць рэзалюцыю.

У напружанай цішы чотка падаюць словы рэзалюцыі. Тав. Красоўскі чытае яе. Гэтыя словы дыхаюць тым, што сёньня і заўсёды яднае ўсіх, яны ідуць ад гарачага комсамольскага сэрца і праверадзены халодным бальшавіцкім розумам. Чоткія моцныя словы ленінскага адзінства, комуністычнай вытрымкі.

Галасуюць. Толькі 7 паднялі рукі супроць і 8 устрымалася. Але ці мае гэта якое—колечы значэньне?..

І раптам, нібы прарваўшыся бурны паток, успыхнуў над заляй Інтэрнацыянал... Усе ўсталі і песьня зазьвінела моцна і ўпэўнена, усё узрастаючы і ўзрастаючы, нібы яна біла з вечна нявычарпальнай крыніцы...

Дэмагогаў вон!

Такі адказ дала Аршанская організацыя на дэзорганізатарскія вылазкі комсамольцаў-опозіцыянэраў.

Што рабілі Шульман і Віткін?

Комсамольцы Шульман і Віткін систэматычна выступалі на сходах ячэек з крытыкай політыкі партыі і комсамолу, паўтараючы завубраныя з прамоў лідэраў троцкісцкай опозіцыі фразы „аб зажыме ў партыі, рэжыме нашага друку" і г. д.

Растлумачваньні не дапамаглі.

На кожным партыйным і комсамольскім сходах, дзе гэтыя таварышы выступалі, ім стараліся растлумачваць усю памылковасьць і шкоднасьць іх поглядаў.

Але дарэмна. Называючы сябе опозіцыянэрамі, гэтыя комсамольцы працягвалі сваю раскольніцкую ў організацыі дзейнасьць.

Існавала опозіцыйная група.

Выклікаਂы ў акруговы камітэт т. Шульман заявіў, што ў іх існуе група з 3-х аднадумцаў, вакол якой яднаецца яшчэ некалькі комсамольцаў. Гэтая група на ўсякія здарэньні ў краіне і партыі рэагавала па-свойму, з **пункту погляду троцкісцкай опозіцыі.**

Карысталіся сакрэтнымі матар'яламі.

— Мы маем і абгаварваем пляцформу троцкісцкай опозіцыі і сьцэнаграфічную справаздачу пленуму Выканкому Комінтэрну—заяўлялі другія опозіцыянэры з гэтай групы.

Мелі сувязь з беспартыйнымі.

У працэсе расьсьледваньня выявілася таксама, што гэтыя комсамольцы-опозіцыянэры, мелі сувязь з людзьмі, якія за раскольніцкую фракцыйную дзейнасьць у партыі выкінуты з яе шэрагаў.

Імкнуліся падкласьці сьвіньню рабочаму-дакладчыку.

На сходзе партыйнай ячэйкі працколектываў Воршы з дакладам аб апошнім пленуме ЦК і ЦКК УсеКП(б) выступаў рабочы—радавы партыец. Комсамольцы опозіцыянэры перад тварам сходу імкнуліся зьбіць яго з толку, у чым ім зусім не пашанцавала. Сход адбыўся і ячэйка цалкам ухваліла рашэньні пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б).

Напады на партыйнае кіраўніцтва.

Гэтым паход комсамольцаў-фракцыянэраў на партыйную ячэйку яшчэ не абмежаваўся. Перад перавыбарамі бюро комсамольскіх ячэек опозіцыянэры яшчэ раз выступалі з поўнымі паклёпніцтва і грубасьці нападкамі на партыйнае кіраўніцтва комсамолам.

Будучы комсамольскімі актывістымі, опозіцыйныя балбатуны ўсялякім чынам выкарыстоўвалі сваё становішча у мэтах вядзеньня раскольніцкай дзейнасьці сярод радовых комсамольцаў.

Але давер'е мас комсамольцаў да гэтых таварышоў з кожным днём усё больш і больш гублялася.

Адзін з іх, былы сакратар комсамольскай ячэйкі дрэваапрацовачнага цэху аршанскай профтэхшколы т. Круцік, у майстэрні працколектыву сталяроў, перад усімі рабочымі, самымі грубымі, хуліганскімі словамі вылаяў аднаго партыйца толькі за тое, што апошні галасаваў на партыйным сходзе за ўхваленьне рашэньняў пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б).

Гэты ганебны факт навочна паказаў шырокім масам комсамольцаў сапраўдны твар тых, хто ідзе па шляху троцкісцкай опозіцыі.

На патрабаваньні організацыі аб прыняцьці рашучых захадаў супроць гэтых таварышоў, Аршанскі акруговы камітэт ЛКСМБ адказаў выключэньнем 3-х фракцыянэраў з шэрагаў комсамолу і прыняцьцем да некаторых з іх іншых мераў саюзнага ўзысканьня.

Далоў раскольнікаў.

(Рэзолюцыя, аднагалосна прынятая на 3-й аб'яднанай конфэрэнцыі Аршанскай гар. організацыі ЛКСМБ).

Заслухаўшы паведамленьне аб опозіцыйных дзеяньнях групкі былых актывістых гар'організацыі, 3-я аб'яднаная конфэрэнцыя ЛКСМБ адабрае мерапрыемствы па барацьбе з гэтымі антыленінскімі вылазкамі і цалкам далучаецца да пастановы АК аб опозіцыйнай дзейнасьці т. т. **Шульмана, Гурэвіча, Крупіка, Віткіна і Газарха.**

Конфэрэнцыя вымаўляе ўпэўненасьць, што азначаныя-праяўленьні опозіцыйнай дзейнасьці, зьяўляючыяся вынікам няўпэўненасьці ў творчай адзіна правільнай ленінскай політыцы партыі і спроб дэмагагічнага скарыстаньня цяжкасьцяў і супярэчнасьцяў соцыялістычнага будаўніцтва—ня маюць і ня знойдуць ніякага падтрыманьня ў організацыі і ўсякія спробы ў напрамку супроцьстаўленьня комсамолу ленінскай партыі страпуць рашучы адпор усёй організацыі.

Конфэрэнцыя ня можа ня выказаць свайго абурэньня антыпартыйнай, раскольніцкай дзейнасьці троцкісцкай опозіцыі ў партыі, якая парушае адзінства партыі, становіцца на шлях стварэньня другой партыі, паслабляе дыктатуру пролетарыяту і цалкам скатваецца ў меншавіцкае балота.

Конфэрэнцыя цалком далучаецца да пастановы апошняга пленуму ЦК і ЦКК аб вывадзе т. т. **Троцкага і Зіноўева** з ЦК, а таксама да пастановы ЦКК аб выключэньні т. т. **Прэабражэнскага, Серабракова** і інш. з партыі, лічыць гэтыя пастановы ленінскімі, адзіна правільнымі і далучаецца ў гэтым пытаньні да рэзолюцыі 2-й гар'парткомфэрэнцыі.

Конфэрэнцыя заклікае ўсю організацыю да яшчэ большага згуртаваньня вакол Ленінскай партыі, яшчэ больш актыўнай дапамогі ёй у працы па соцыялістычным будаўніцтве.

Няхай жыве адзіная Ленінская партыя.

Далоў фракцыянэраў-раскольнікаў.

Прэзыдыум конфэрэнцыі.

Пад сьцягам Леніна!

(Рэзолюцыя сходу актыву менскай гарорганізацыі).

1. Сход актыву Менскай організацыі комсамолу, заслухаўшы і абгаварыўшы даклад сакратара ЦК КП(б)Б тав. Васілевіча: «XV зьезд партыі і задачы комсамолу», цалкам і поўнасьцю далучаецца да пастановы пленуму ЦК УсеЛКСМ, які выказвае лінію ўсяго двухмільённага комсамолу, стаячага на позіцыях партыі, яе Ленінскага ЦК УсеКП, які рашуча выказваецца супроць троцкісцкай опозіцыі, яе меншавіцкай лініі.

Партыя і яе ЦК сваей ленінскай лініяй, у працягу мінулых двух год з часу XIV зьезду, забясьпечылі рабочай клясе, усёй краіне ўзмацненьне дыктатуры пролетарыяту, пасьпяховае прасоўваньне наперад, па шляхох соцыялістычнага будаўніцтва, рост і ўзмацненьне аўторытэту і падтрыманьне нашай краіны з боку сусьветнага рэволюцыйнага пролетарыяту.

Тэзісы ЦК УсеКП да XV зьезду адбіваюць сапраўднае становішча ў краіне і вызначаюць правільную лінію, якая як адзіная, ленінская забясьпечыць далейшыя посьпехі па шляху прасоўваньня да соцыялізму.

Абгаварэньне пытаньняў XV зьезду партыі ў Менскай організацыі комсамолу будуецца на падставе ўхваленьня тэзісаў ЦК УсеКП, выказваньня бязумоўнага давер'я і падтрыманьня лініі партыі і ЦК, рашучага адхіленьня троцкісцкіх контртэзісаў, руйнуючага адпору паклёпніцкім, антыпартыйным, меншавіцкім заявам опозіцыі.

2. Сход з абурэньнем адносіцца да новага, анты-партыйнага, анты-савецкага і па сутнасьці контр-рэволюцыйнага выступленьня зарваўшайся опозіцыі ў дні Кастрычнікавай урачыстасьці ў Маскве і Леніградзе.

Сход далучаецца да рашэньня па гэтым пытаньні ЦК КП(б)Б і Менскага АК КП(б)Б і патрабуе з усёй партыяй безадкладнага выключэньня правадыроў опозіцыі з партыі, з ёю ўжо фактычна парваўшых.

Партыя без троцкістых—меншавікоў будзе яшчэ больш адзінай і аўторытэтнай ў самых шырокіх масах рабочае клясы, рабочае моладзі і ленінскага комсамолу.

3. Сход лічыць правільнай пастанову ЦК УсеЛКСМ у пытаньнях працы і асьветы рабочай моладзі і ўдзелу яе ў соцыялістычным будаўніцтве, рашуча адзначае дэмагогічную заяву аб тым, што быццам пагоршылася становішча ўсёй рабочай моладзі, аб тым, быццам комсамол здае кастрычнікавыя заваёвы рабочай моладзі і іншыя паклёпніцкія заявы. Пагоршаньне становішча некаторай часткі рабочай моладзі (скарачэньне процантнай броні, гэта зн. прытоку падросткаў у вытворчасьць)—ёсьць часовая ахвяра з боку рабочай моладзі, якая аплоціцца з прыбыткам усёй працы па рацыяналізацыі і разьвіцьці прамысловасьці, якая павінна атрымаць падтрыманьне ўсёй рабочай моладзі, усяго комсамолу.

4. Сход рашуча адхіляе паклёпніцкія заявы аб бюрократызацыі саюзнага кіраўніцтва і паслабленьні пролетарскага ядра і аб прыжыме комсамолу партыяй. Гэтыя заявы самі па сабе ня новыя, яны і раней рабіліся меншавікамі, дробна-буржуазнымі элемэнтамі, пралазіўшымі ў комсамол і жадаючымі супроцьпаставіць комсамол партыі, скарыстаць яго супроць яе, цяпер яны выходзяць з боку опозіцыі, якая адарваўшыся ад жыцьця не прыкмячае таго, што комсамольскі апарат, больш чым калі-небудзь арабочаны і прадаўжае ўцягваць у сябе ўсё новыя колы растучага рабочага актыву; рабочая моладзь узмацніла сваё кіраўніцтва сялянскай моладзьдзю, комсамол больш чым калі-небудзь стаў важнейшым фактарам грамадзкага, політычнага жыцьця краіны, як раз на падставе кіраўніцтва партыі, ленінскага выхаваньня ёю комсамолу.

5. Сход лічыць, што комсамольская організацыя Менску, як і ўвесь ленінскі комсамол з абгаварэньня пытаньняў XV зьезду партыі, глыбокага і ўсебаковага вывучэньня тэзісаў ЦК УсеКП(б), выйдзе яшчэ больш бальшавіцка вырасшым, адзіна, па-ленінску згуртаваным вакол партыі, яе ЦК, супроць троцкістаў-меншавікоў,—раскольнікаў нашае партыі. Комсамол пад сьцягам партыі, яе кіраўніцтвам будзе і ў далейшым адпаведна несьці імя Леніна.

На раздарожжы.



Які сабе шлях выбрала апазіцыя.

Ганебная гісторыя.

Гісторыя фракцыйнай барацьбы.

Опозіцыянэры і іх правадыры ўсё яшчэ прадаўжаюць называць сябе „сапраўднымі" „ленінцамі" і „бальшавікамі", „нязьменнымі" пасьлядоўцамі ленінізму і „бязумоўнымі" „рэволюцыянэрамі-комуністымі".

Аднак, досыць хаця-б крыху зірнуць на гісторыю так-званай „новай" опозіцыі і яе правадыроў, каб зразумець,

як лёгка яны спэкулююць імем Леніна,

як ні кропелькі не саромячыся, яны замазваюць свой сапраўдны паўменшавіцкі твар імем самага дарагога нам чалавека, рэволюцыянэра і вучыцеля Ільліча.

„Новая" опозіцыя ўзьнікла і аформілася на 14 партыйным зьезьдзе ў сьнежані 1925 г. Гэта быў адзін з найважных зьездаў нашай партыі.

І вось тут, на 14 партзьезьдзе ўпяршыню ва ўсёй сваёй „вялікасьці" выступіла «новая» опозіцыя на чале з тав. Зіноўевым. Дзелавая праца зьезду была парушана, бо опозіцыянэры выступілі з процівалеглымі поглядамі і думкамі, са сваім уласным „вучэньнем".

Опозіцыя пачала з таго, што адхіліла вучэньне Леніна аб будаўніцтве соцыялізму ў аднэй краіне:

яна заявіла, што ў нашай краіне, тэхнічна адсталай, някультурнай, з пераважнай большасьцю сялянскага насельніцтва, соцыялізм мы пабудаваць ня можам. І потым яна патрабавала свабоды фракцый і груціровак унутры партыі, супроць якіх жорстка і рашуча змагаўся тав. Ленін.

Бязумоўна, зьезд бальшавікоў-ленінцаў ня мог згадзіцца з выдумкамі „крытыкаў" ленінізму. 14-ты партзьезд асудзіў выступленьне опозіцыянэраў, іх „тэорыю" і заклікаў іх да парадку, да дысцыпліны, абавязаў іх падначаліцца рашэньням зьезду.

Але яны ня толькі не падначаліліся рашэньням зьезду, але, наадварот, пачалі навертую бальшавікоў фракцыйную працу і сыстэматычную барацьбу супроць партыі, супроць яе ленінскага ЦК.

Тут-жа, у хуткім часе пасьля зьезду,

Зіноўеў злучыўся з Троцкім,

усе свае ранейшыя нападкі на Троцкага ўзяў назад, заключыў з ім саюз і канчаткова скаціўся да трацкізму. Зіноўеў і Троцкі яшчэ тады стварылі ўнутры партыі опозіцыйную фракцыю.

У сваёй барацьбе, опозіцыянэры ўжывалі

антыпартыйныя прыёмы:

улетку 1926 году яны схаваліся ў падпольле, склікалі ў лесе нелегальныя сходы, распаўсюджвалі сакрэтныя партыйныя дакуманты, вербавалі новых староньнікаў і г. д.

Разам з раскольніцкай фракцыйнай барацьбою ўнутры партыі,

опозіцыя пачала пушчаць свае шчупальцы ў комсамол,

спрабуючы яго завербаваць на свой бок і выкарыстаць у сваіх раскольніцкіх інтарэсах супроць ЦК і ўсёй партыі. Але гэты нумар не прайшоў. Комсамол, разам з партыяй, даў опозіцыянэрам адзінадушны адпор. Партыя і комсамол зноў рэзка асудзілі опозіцыйных „мысьліцеляў", „лесавікоў-падпольшчыкаў".

Але і на гэтым

опозіцыянэры не ўгаманіліся.

К восені 1926 году яны вылезьлі з падпольля, пакінулі свой лес і перайшлі ўжо да адкрытай атакі на партыю і ЦК. Опозіцыянэры пачалі гастраляваць па рабочых ячэйках Масквы, Ленінграду і іншых гарадоў, абрушваючыся на ЦК і яго Ленінскую політыку, усялякім чынам падрывалі яго аўторытэт, патрабавалі пачаць дыскусію па тых пытаньнях, якія былі партыяй ужо вырашаны і г. д.

І ўсё-ж як ні стараліся опозіцыянэры,

за імі не пашла ніводная рабочая ячэйка.

Рабочыя-комуністы на славу пачаставалі фракцыянэраў, рабочыя-комуністы засталіся вернымі бальшавіцкаму ЦК.

Пасьля такога „генэральнага" бою опозіцыя сама адчула, што яна моцна села на мель—і была прымушана адступіць. 16 кастрычніка 1926 году правадыры опозіцыі напісалі двудушную заяву, у якой абяцалі падначаліцца ўсім рашэньням 14-га партзьезду, ЦК і ЦКК, абяцалі распусьціць сваю фракцыю, спыніць раскольніцкую барацьбу і г. д.

Аднак, у хуткім часе ўся наша партыя ўбачыла, што

опозіцыйныя абяцанкі хлусьлівыя.

Партыя ясна ўбачыла, што опозіцыя з сваёй заявы зрабіла дрэньненькую маску, каб схаваць ад партыі свой фракцыйны твар.

З новай сілай абрушылася опозіцыя на партыю і Комінтэрн, пасыпаліся новыя паклёпы на ЦК. Троцкі абвініў ЦК у „перараджэньні", у „тэрмідорыянстве", выказаў свае сумненьне ў мэтазгоднасьці абароны СССР ад капіталістых, часковае паражэньне кітайскай рэволюцыі растлумачыў тым, што быццам Комінтэрн і партыя вялі няправільную політыку.

Побач з гэтым абвінавачваньнем, опозіцыя пачала ўзмоцненую раскольніцкую працу ў Комінтэрне: яна заключыла саюз з адступнікамі комунізму, з выключанымі з нямецкай компартыі Маславым і Рут-Фішэр, забясьпечвала іх партыйнымі дакумантамі, супроцьпартыйнымі артыкуламі і матар'яламі і г. д.

Опозіцыянэры і іх правадыры да таго распаліліся, што 9-га мая Зіноўеў выступіў на беспартыйным сходзе з жорсткімі нападамі і паклёпам на ЦК, а 9-га чэрвеня Троцкі і Зіноўеў удзельнічалі разам з нэпманамі ў політычнай дэмонстрацыі ля Яраўслаўскага вакзалу ў Маскве. І гэта было якраз у тыя дні, калі ангельскі імпэрыялізм з асаблівай злосьцю і ненавіджаньнем нападаў на СССР.

Такіх дзейнасьцяў опозіцыі

партыя больш не магла цярпець.

Партыя не магла дазволіць кучы трацкістых зрываць нармальную, творчую і будаўнічую працу партыі. З гэтай прычыны на аб'яднаным пленуме ЦК і ЦКК у жніўні гэтага году было пастаўлена пытаньне аб выключэньні Троцкага і Зіноўева з ЦК. На гэтым пленуме правадыры опозіцыі падпісалі новую заяву, у якой зноў абяцалі спыніць фракцыйную барацьбу, падначаліцца ўсім рашэньням партыі, ЦК і ЦКК, адмовіцца ад падтрыманьня нямецкіх здраднікаў комунізму і г. д. У інтарэсах захаваньня адзінства партыі, пленум ЦК і ЦКК пакінуў Троцкага і Зіноўева ў ЦК, але папярэдзіў, што гэта апошняя мяжа цярпеньня партыі.

Але не прайшло і 3-х месяцаў пасьля жнівеньскага пленуму, як троцкісцкая опозіцыя зноў падняла сваю галаву, зноў пачала нячувалую злачынную барацьбу супроць партыі. Правадыры опозіцыі дайшлі да таго, што

абсталявалі нелегальную друкарню,

наладзілі сувязь і супрацоўніцтва з беспартыйнымі і буржуазнымі інтэлігентамі, організавалі свае раённыя камітэты, свой уласны цэнтр, устанавілі асобны пароль (пропуск), друкавалі ў кампанію з ўсякага роду чуждымі Савецкай уладзе і партыі прахадзімцамі супроцьпартыйныя матар'ялы і г. д.

Аб чым усё гэта кажа?

Аб тым, што опозіцыя організуе ці хоча організаваць у СССР другую партыю троцкісцкага духу, троцкісцкага напрамку, каб змагацца супроць партыі Леніна, супроць Ленінскага ЦК. Вось, куды скацілася опозіцыя, вось куды прывялі яе правадыры Троцкі і Зіноўеў!

Партыя не магла і не павінна была дапусьціць далейшага зьдзеку над ёю кучкі троцкісцкіх опозіцыянэраў. Партыя павінна была цьвёрдай рукой адсячы зарваўшыхся опозіцыянэраў. І партыя гэта зрабіла: яна выключыла з сваіх шэрагаў Серабракова, Прэабражэнскага, Шарава і іншых опозіцыянэраў, яна выключыла Троцкага і Зіноўева з членаў ЦК.

Вось увесь двухгадовы шлях «новай» опозіцыі,

вось яе ганебная антыленінская гісторыя. Гісторыя простая: пачатак ляжыць у патрабаваньні свабоды груціровак і фракцый, а канец—у стварэньні другой троцкісцкай партыі.

15-ты партыйны зьезд па заслугах ацэніць падрыўную працу опозіцыі і яе правадыроў, ён узнагародзіць яе вартым кляймом за яе раскольніцкую барацьбу супроць партыі, за сувязь са здраднікамі нямецкай компартыі, за груціроўку вакол сябе варожых сіл.

Гэта будзе такі ж ганебны канец опозіцыі, як і яе двухгадовая гісторыя.

Ф. П. В.

Чакаем вескага слова прокуратуры.

Яшчэ раз аб прычынах самазабойства комсамолкі Казлоўскай.

Патрабуем дасканалага расьсьледваньня гэтай справы і прыцягненьня вінаватых да самае суровае кары.



Патрабаваньні мас трэба выканаць.

Ня можа быць ніякага зьдзіўленьня ў тым, што гісторыя з самазабойствам комсамолкі Казлоўскай ускалыхнула ўсю савецкую грамадзкасьць.

Толькі той, хто ўжо зусім згубіў пачуцьцё паважаньня чалавека, хто зьяўляецца глухім да чалавека, які знаходзіцца ў вялікай небясьпецы і крычыць аб дапамозе,—толькі той можа прайсьці міма гэтага жудаснага здарэньня, міма таго бруду, які залівае, атручвае ўсё чалавечае, што маецца на заводзе „Комінтэрн".

Вось чаму правы таварышы, патрабуючыя прыцягненьня адказных як за самазабойства Казлоўскай, так і за прычыны, якія прывялі яе да гэтага,— да самай суровай адказнасьці.

Мы ўпэўнены, што гэтыя патрабаваньні органы прокуратуры будуць мець на ўвазе і зробяць належныя вынікі для таго, каб падобныя гісторыі ў краіне пролетарскай дыктатуры больш ня мелі месца.

Мы так сама ўпэўнены і ў тым, што кожная комсамольская ячэйка, кожны комсамолец, улічваючы гэта ганебнае зьявішча, яшчэ раз праверыць, як выконваюцца дырэктывы саюзу аб павышэньні цаны чалавеку ў комсамоле, каб усё дрэннае, што ганьбіць нашы шэрагі,—пахаваць.

Пастанова Бюро ЦК ЛКСМБ.

Выпіска

з пратаколу пасяджэньня бюро ЦК ЛКСМБ ад 1 лістапада 1927 году.

Слухалі:	Пастанавілі:
11. Інформацыя аб зьмешчаным у «Чырвонай Зьмене» матар'яле аб самазабойстве комсамолкі Казлоўскай.	Прасіць ЦКК КП(б)Б дэтальна высьветліць справу, зьвязаную з гэтым фактам на месцы.

Вінаватых прыцягнем да адказнасьці.

Заява старшыні ЦКК КП(б)Б тав. Калніна.

Лічу, што комсамолка т. Казлоўская стала на шлях самазабойства з-за недастаткова чулых адносін да яе з боку цэлага шэрагу грамадзкіх організацый, якія не змаглі своечасова ўлічыць абставіны і цяжкасьці перад якімі т. Казлоўская апынулася.

Такія нядбайныя адносіны да яе падштурхнулі зарадзіўшуюся ў яе думку аб самазабойстве.

У той-жа час я лічу, што адмаўленьне ад аказаньня мэдыцынскай дапамогі перайшло ўсякія межы валакіты і халатнасьці.

Выходзячы з усяго сказанага, ЦКК КПБ намеціла сумесна з ЦК ЛКСМБ дэтальна расьсьледваць гэту справу, і каб вінаватых у бяздушных і казённых адносінах да Казлоўскай прыцягнуць да адказнасьці.

Неабходна суровая кара,

так заяўляе Наркам Аховы Здароўя БССР тав. Барсукоў.

Выпадак з тав. Казлоўскай жудасны ня толькі таму, што ён характарызуе ўмовы працы на заводзе, але і таму, што дае ганебны малюнак таго распаду, які існаваў у комсамольскай ячэйцы.

Тыя нечалавечыя пакуты, якія прышлося перацярпець Казлоўскай ня толькі пасьля прыёму атруты, але галоўным чынам у часе працы на заводзе, прымушаюць зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу **ўсёй савецкай грамадзкасьці і органаў улады на папярэджаньне гэткіх ганебных зьявішчаў.**

Ахране працы трэба больш уважліва пераглядзець умовы працы рабочых і работніц, а комсамольскай ячэйцы ачысьціцца ад прымазаўшыхся тыпаў, якія нясуць у комсамол элемэнты хуліганшчыны і чубараўшчыны.

Трэба самым бязьлітасным образам, аж да самых суровых мер пакараньня, прыцягваць да адказнасьці такіх безадказных тыпаў, як сакратар ячэйкі ЛКСМБ, старшыня фабзавкому і дырэктар заводу, якія, нягледзячы на неаднаразовыя заявы асобных таварышоў аб становішчы справы на заводзе, палец аб палец ня стукнулі, каб існуючыя злачынствы зьнішчыць. Ці-ж дапусьціма такое становішча, калі не знашлося навяат і павозкі, каб уміраючую Казлоўскую адвезьці ў бальніцу.

Трэба спадзявацца, што суд і комсамольская організацыя зробяць належныя вынікі.

Пролетарскае правасудзьдзе павінна са ўсёй суровасьцю аднесьціся да віноўнікаў гэтай жудаснай драмы.

Няхай гэты суровы прыгавор будзе ўрокам для зарваўшыхся хуліганаў, якія ганьбяць пролетарскую справу.

Трэба зрабіць паказальны процэс.

Заява нач. галоўміліцыі БССР тав. Кроля.

Факт самазабойства комсамолкі Казлоўскай—не адзіны на гуце „Комінтэрн".

Жыцьцё комсамольцаў і моладзі гуты, якое тане ў папойках, бойках і гвалтаваньні батрачак, а таксама бяздушныя, фармальныя і, я-бы сказаў, злачынныя адносіны да Казлоўскай з боку ячэйкі патрабуюць вылучэньня ад ЦК ЛКСМБ камісіі для дэтальнага расьсьледваньня ўсёй гэтай справы.

Што-ж датычыць няўчыненьня неабходнай мэдыцынскай дапамогі, перашкод завкому даць добрую павозку і зьдзек майстраў над рабочымі і вучнямі, то павінны быць прыняты меры афіцыйнага характару.

Трэба зрабіць паказальны процэс.

Ня месца на савецкім заводзе.

Слова групы комсамольцаў.

Азнаёміўшыся з матар'яламі «Чырвонай Зьмены» аб самазабойстве Казлоўскай, нас проста зьдзіўляе тое, што такія зьявішчы, аб якіх апавядае корэспондэнт, маюць месца на савецкім заводзе.

Чым-жа іншым, як ня гэтымі адносінамі, можна тлумачыць і факт самога самазабойства і жаданьне двух хлапцоў папасьці ў банду і многае іншае.

ЦК комсамолу і прокуратура павінны прыняць усе меры да таго, каб вінаватыя, і ня толькі ў самазабойстве Казлоўскай, а і ў дрэнным абучэньні вучняў, нечалавечых умовах жыцьця рабочай моладзі і г. д. былі прыцягнуты да самай суровай кары, давёўшы ўсю справу да судовага процэсу.

Паказальны процэс павінен паказаць, як сурова карае пролетарская дзяржава тых, хто застаецца глухім і сьляпым у адносінах да жыцьця і запатрабаваньняў рабочай моладзі і што, тым болей, такія элемэнты ня могуць мець месца на савецкім заводзе.

Група комсамольцаў.

За далейшае расьсьледваньне

выказваецца намесьнік старшыні СНК тав. Карклін.

Факт самагубства комсамолкі Казлоўскай, выкліканы бяздушнымі адносінамі да яе і зьдзекамі, аб якіх апавядаецца ў 122 нумары «Чырвонай Зьмены», бязумоўна, зьяўляецца з раду вон выходзячым, несьцярпімым у рабочым асяродзьдзі і нашай савецкай краіне.

Рэдакцыя «Чырвонай Зьмены» правільна зрабіла, удзяліўшы гэтаму самагубству шмат увагі, вынесшы яго на суд і абгаварэньне нашай грамадзкай думкі.

Аднак, мне здаецца, што справа, аб якой ідзе гутарка, пакуль што ня высьветлена з дастатковай дакладнасьцю.

Пазнаёміўшыся з ёю па матар'ялах «Чырв. Зьм.», для мяне асабіста засталіся незразумелымі многія акалічнасьці.

Недахоп матар'ялаў вымушае мяне пакуль што ўстрымацца ад канчатковай ацэнкі справы. Зраблю толькі адну заўвагу.

Ці не памыляецца корэспондэнт «Чырвонай Зьмены», які зьбіраў гэтыя матар'ялы, звальваючы ўсю віну за самагубства Казлоўскай на цэлую комсамольскую ячэйку? Мне здаецца, што могуць быць вінаваты і павінны адказваць за свае бяздушныя адносіны, толькі асобныя комсамольцы,—наогул адзінкі, а ніяк ня цэлы колектыў.

Вывад: Дзеля канчатковага суджэньня патрэбна далейшае і больш дэтальнае расьсьледваньне справы з боку ЦК ЛКСМБ і ўсіх іншых зацікаўленых організацый, якое бязумоўна, ускрые шмат цікавых і немалаважных падрабязнасьцяў, пакуль што невядомых і застаючыхся ў цяні.

Міжнародны агляд.

СССР—сьцяг прыгнечаных.

Замежныя дэлегаты пераканаліся ў пасьпяховасьці будаўніцтва соцыялізму ў СССР.—Савецкі Саюз—пуцяводная зорка працоўных.—Вэнгерскія рэволюцыянэры перад буржуазным судом.

Уражаньні замежных дэлегатаў.

У Маскве на сьвяткаваньні дзесяцігодзьдзя Кастрычнікавай рэволюцыі прысутнічалі прадстаўнікі амаль усіх краін і народаў.

Былі людзі з розным сьветапоглядам, з рознымі палітычнымі імкненьнямі.

Але ўсе яны пераканаліся ў тым, што працоўнымі СССР разгорнута грандыёзная праца па перабудове сьвету на комуністычных пачатках.

Усе яны пабачылі, як пролетарыят Савецкага Саюзу разам з працоўным сялянствам будуе соцыялістычную гаспадарку і культуру.

Вось што кажуць асобныя дэлегаты:

Старшыня ангельскай дэлегацыі ў артыкуле, напісаным спэцыяльна ў газэту ангельскіх вуглякопаў зазначае, што ён ніколі ня бачыў гэткага грандыёзнага відовішча, як дэмонстрацыя маскоўскага пролетарыяту 7-га лістапада.

Падрабязна апісаўшы парад на Чырвоным пляцы, ён падкрэсьлівае моцную сувязь рабочых і сялян з Чырвонай арміяй.

— «Гэткага яднаньня арміі і народу,—піша ён,—ня сустрэнеш ні ў якой іншай краіне.

Нас хочуць запэўніць (буржуазія, відома) у нянавісьці насельніцтва Савецкага Саюзу да свайго ўраду.

Мы-ж на працягу цэлага дню былі сьведкамі бурных воплескаў па адрасу Савецкага ўраду, сябры якога ўвесь час знаходзіліся сярод радасных мас.

Для ўсіх нас, замежных дэлегатаў,—піша далей,—дзень 7-га лістапада застанецца на ўсё жыцьцё прыкладам таго, што можа даць пролетарская рэволюцыя прыгнечаным народным масам».

Старэйшыя ўдзельнікі нямецкага рабочага руху зазначаюць што:

— 7-га лістапада на Чырвоным пляцы ў Маскве і па ўсім СССР рабочыя і сяляне так продэманстравалі сваю моц і падрыхтаванасьць абараняць да апошняй кроплі крыві пачатую справу будаўніцтва соцыялізму, што наўрад ці хопіць у ворагаў Савецкага Саюзу сьмеласьці пайсьці на першую ў сьвеце рабочую дзяржаву.

Старшыня нямецкай рабочай дэлегацыі сказаў:

— Ужо да 7 га лістапада мы з таварышамі аб'ехалі шэраг мясцовасьцяў СССР, дзе на кожным кроку бачылі пабудову новых вялізарных будынкаў, фабрык і заводаў.

Мы бачылі, як Савецкая ўлада прыкладае ўсе сілы да таго, каб паляпшаць экономічнае становішча працоўных.

Аб гэтым кажуць добра організаваныя ясьлі, санаторыі, дзіцячыя дамы, дамы адпачынку.

Італьянец Жыно ніяк ня мог сабе ўявіць, што рабочыя і сяляне СССР зьяўляюцца поўнымі гаспадарамі.

— Але яшчэ да 7-га лістапада я пераканаўся,—кажа ён,—што я быў ня праў у сваіх марах аб СССР.

Характар сьвяткаваньня паказаў кожнаму з нас, што ён знаходзіцца ў краіне дыктатуры пролетарыяту.

Сябры кітайскай рабочай дэлегацыі выказалі надзвычайную радасьць па поваду таго, што ім давялося ў дзень сьвяткаваньня быць у чырвонай сталіцы рэспублікі працы.

—Кастрычнік,—кажуць яны,—гэта сьвята народу, які атрымаў уладу.

Мы, кітайскія рабочыя вядзем яшчэ толькі падрыхтоўку да свайго Кастрычніка. Але мы моцна верым у тое, што і наш Кастрычнік не за гарамі.

Прадстаўнік Паўночнай Афрыкі заявіў:

— Цяжка перадаць тое, што так радасна перажылі мы ў дзень 7-га лістапада.

У гэты дзень мы цалкам пераканаліся ў перамозе пролетарскае рэволюцыі.

Вось тыя словы, тыя думкі, якія выказваюць усе замежныя дэлегацыі і дэлегаты паасобку.

Уся гэта аграмадная колькасьць людзей, якая прыехала з замежаў, сама пабачыла, як жывуць працоўныя СССР.

Яны самі пераканаліся ў тым, што гаспадаром СССР зьяўляецца рабочая кляса і працоўнае сялянства.

Усім замежным таварышам застаецца, пасьля свойга звароту, сказаць рабочым праўду аб СССР, каб гэтым самым раскрыць хлусьню, якую распаўсюджвае буржуазія і яе лёкаі—соцыял-демократы.

Буржуазія аб дзесяцігодзьдзі Кастрычніка.

Каб быў поўны малюнак, як адклікнуліся прыяцелі і ворагі аб сьвяткаваньні Кастрычніка, цікава прывесьці думкі і буржуазіі.

Так, на прыклад, нямецкая буржуазная газэта піша:

— Надзеі на зьнішчэньне савецкага ладу не апраўдаліся.

Утвораная Ленiным сыстэма трымаецца і без свайго творца і правадыра».

Другая буржуазная газэта піша, што ня гледзячы на тое, што капіталісты ненавідзяць СССР, апошні—**вялікая дзяржава, з якой астатні сьвет павінен лічыцца.**

Цікава тое, што японскі друк, зазначаючы неабходнасьць больш цеснай сувязі Японіі з СССР, падкрэсьлівае, што **рабочыя ўсяго сьвету шмат абавязаны паляпшэньнем свайго становішча політыцы, якую вядзе Савецкі ўрад.**

70 гадоў катаргі вэнгерскім рэволюцыянэрам.

У Будапэшце (сталіцы Вэнгрыі) скончыўся суд над групай рэволюцыянэраў на чале з Санто.

Санто прысуджаны да 8 з паловаю год катаргі.

Падсудны Вагі, правадыр рэволюцыйнай рабочай соцыялістычнай партыі, які адышоў ад меншавікоў, прысуджаны да 4 з паловаю гадоў турмы!

Усе абвінавачаныя, ў ліку 53 чалавек, прысуджаны да 70 гадоў і 11 месяцаў катаргі.

Цікава тое, што прыгавор ня можа паказаць на тое, у чым, уласна, абвінавачваюцца прысуджаныя.

Прыгавор абмяжоўваецца паказаньнем толькі таго, што іх дзейнасьць накіравана супроць існаваньня капіталістычнага ладу.

Усе падсудныя ў часе процэсу трымалі сябе надзвычайна сьмела.

— Усе яны сьмела заяўлялі, што і надалей не адмовяцца ад рэволюцыйнай дзейнасьці.

Санто ў сваёй апошняй прамове сказаў:

— «**Мы лічым сваёй пролетарскай бацькаушчынай Савецкі Саюз. Наша пролетарская бацькаўшчына, на якую нападаў пракурор, сьвяткуе сёньня свой дзесяцігадавы юбілей».**

Пры гэтых словах Санто і ўсе падсудныя ўстаюць з сваіх месц; старшыня патрабуе, каб падсудныя селі, але яны застаюцца стаяць.

Санто кажа далей:

— „Ад імя вэнгерскіх рабочых і сялян, а таксама ад імя таварышоў, якія знаходзяцца ў турмах, мы ў 10 гадавіну пераможнай дыктатуры пролетарыяту СССР **пасылаем адсюль сваё рэволюцыйнае прывітаньне УсеКП(б).**

Тут на лаўцы падсудных, наша сэрца б'ецца ва ўнісон з сэрцам сусьветнага пролетарыяту, у гонар пролетарыяту СССР, які стварыў сапраўднае цуда ў краіне, дзе пахаваны наш несьмяротны Ленін».

— **Я веру ў комуністычную партыю Вэнгрыі**—закончыў Санто,—**і ва ўзброенае паўстаньне вэнгерскага пролетарыяту.**

Пасьля гэтых слоў Санто старшыня пазбаўляе яго слова.

Апошнім падсудным старшыня **забараняе ўспамінаць аб СССР.**

Нікому з падсудных старшыня не дазволіў дагаварыць да канца.

Чытаньне прыгавору падсудныя сустрэлі крыкамі: «Няхай жыве вэнгерская компартыя! Няхай жыве ўзброенае паўстаньне!»

Конгрэс прыяцеляў СССР зачыніўся.

У Маскве закончыў сваю працу конгрэс (зьезд) прыяцеляў СССР.

Зьезд адчыніўся пры наяўнасьці 957 дэлегатаў, больш як ад 43 краін.

Але ў часе зьезду лік дэлегацый узрастаў. Так, напрыклад, у дзень конгрэсу прыехала дэлегацыя з Польшчы і Паўднёвай Афрыкі.

Акрамя таго, у апошні дзень конгрэсу атрыманы тэлеграмы ад двух дэлегацый, якія затрымаліся ў дарозе.

Конгрэс заклікае ўсіх працоўных сьвету да абароны СССР, да барацьбы супроць небясьпекі новай імпэрыялістычнай вайны.

Конгрэс сказаў праўду аб краіне працоўных усяму сьвету.

Дэлегаты конгрэсу раскажуць працоўным сваіх краін, усё тое, што бачылі ў СССР. Яны дапамогуць таму, каб працоўныя ўсяго сьвету яшчэ больш згуртаваліся вакол СССР, каб яшчэ мацнейшым быў хаўрус працоўных зямной кулі з працоўнымі СССР.

Алёнін.



Пазыка індустрыялізацыі дружна падтрымана ўсёй рабочай моладзью Менску. Падтрымана ня словамі, а справай. На здымку, зьлева направа, падпісаўшыяся на пазыку рабочыя хлапцы: Елянковіч—вучань—вадаправодчык комсамолец падпісаўся на 210 проц. сваёй зарплаты; зьльводаўцы-комсамольцы Мартынаў і Стронгін, падпісаліся абодва на 110 проц. зарплаты; Нарон—беспартыйны з заводу „Беларусь“, падпісаўся на 90 проц. сваёй зарплаты; Гінзбург—комсамолец з заводу „Восход“, падпісаўся на 120 проц.; Гутман—сьлесар—комсамолец, падпісаўся на 110 проц. зарплаты.

Як мы ўносім грошы.

Ведай новыя правілы.

Першы грашовы ўзнос за облігацыі пазыкі індустрыялізацыі павінен быць зроблены не пазьней 15-га лістапада. Аднак, колектывам рабочых і служачых, дзе выдача зарплаты ўтвараецца 20-га лістапада, дазваляецца адтэрмінаваць першы ўзнос па ўсёй колектыўнай падпісцы да 23 лістапада.

У паасобных прадпрыемствах і ўстановах, дзе зарплата выдаецца 25-га, прыём першага ўзносу можа быць адтэрмінаваны да 26-га лістапада.

У мэтах палягчэньня падпіскі спазьніўшымся сябрам колектываў, ім прадастаўляецца права абмежаваць узносы ад 15—26-га лістапада 2 рублямі за поўныя облігацыі і ўтвараць узносы па падпісцы ў наступных разьмерах: першы ўзнос—2 руб. за 25-рублёвую облігацыю (40 кап. за адну пятую облігацыі) да 15—26 лістапада; другі і трэці паўмесячныя ўзносы да 20—26 сьнежня; 4—9 паўмесячныя ўзносы на працягу студзеня, лютага і сакавіка 1928 году; 10 і 11 паўмесячныя ўзносы па 3 руб. (60 кап. за адну пятую облігацыі) у працягу красавіка 1928 году.

Беларусь дасьць 2 мільёны.

Сёньня заканчваецца кампанія па рэалізацыі пазыкі індустрыялізацыі,

Спачатку падпіска была разгорнута вакол лёзунгу ахопу ўсіх 100 проц. членаў профсаюзаў пазыкай.

Але хутка гэты лёзунг быў пашыраны. Высунулі задачу ахопу пазыкай 50 проц. месячнага заробку колектываў служачых і 30 проц. месячнага заробку колектываў рабочых.

Гэта задача да сучаснага моманту амаль што выканана.

Нельга не адзначыць таго пад'ёму, з якім рабочыя і служачыя прымалі ўдзел у распаўсюджваньні пазыкі індустрыялізацыі. Нярэдкія выпадкі, калі паасобныя рабочыя, пры 80—100 руб. зарплаты ў месяц, падпісваюцца на 250—300 руб. Але гэты пад'ём назіраецца толькі ў цэнтры і ў некаторых акруговых гарадох. Што-ж датычыць раёнаў, дык там справа з падпіскай абстаіць ня зусім здавальняюча.

Праведзеная па Беларусі падпіска да гэтага тэрміну, па няпоўных зьвестках Наркамфіну, дала звыш 1.900.000 руб.

Сваё заданьне—даць 2 мільёны пазыкі—БССР выканае.

М. З.



Альлё! Што зрабіла ваша ячэйка ў справе рэалізацыі пазыкі?

З фронту пазыкі.

Прыём падпіскі працягваецца.

У мэтах прадстаўленьня больш працяжнага тэрміну для рэалізацыі пазыкі індустрыялізацыі, Дзяржбанк Беларусі будзе ўтвараць прыём падпіскі для вясковых колектываў да 25-га сьнежня, а для гарадзкіх—да 1-га сьнежня гэтага году.

У гэты-ж тэрмін облігацыі пазыкі будуць прадавацца па рынкавай цане таксама індывідуальным падпісчыкам.

Наперадзе галоўная каса.

На 12-е лістапада крэдытнымі ўстановамі Менску афармлена падпіскі на пазыку індустрыялізацыі на суму 301.090 рублёў.

Наперадзе ўсіх ідзе галоўная каса ашчаднасьці, якая распаўсюдзіла пазыкі **на 121 670 рублёў**

На 85.680 рублёў рэалізаваў пазыкі Дзяржбанк Беларусі.

У акругах.

На 10-е лістапада па **Бабруйскай акрузе** рэалізавана пазыкі індустрыялізацыі на 183.590 рублёў. З гэтай сумы—82.515 рублёў афармленай і неафармленай падпіскі падае на раёны акругі.

На гэты-ж тэрмін у **Гомельшчыне** распаўсюджана пазыкі індустрыялізацыі на **520.000 рублёў.**

Па рэалізацыі пазыкі Гомельская акруга стаіць на першым месцы ва ўсёй Беларусі.

Пазыка індустрыялізацыі на экране.

Наркомфінам БССР атрымана з Масквы 8 кіно-фільмаў аб пазыцы індустрыялізацыі, гэтыя фільмы дэмонструюцца ва ўсіх акругах Беларусі.

Моладзь падпісваецца.

Пазыка індустрыялізацыі знайшла жывы водгук сярод вытворчай і усёй працоўнай моладзі сталіцы. Атрымоўваючы невялічкія аклады пэнсіі, **моладзь падпісвалася на пазыку на 100 проц. і звыш свайго месячнага заробку.**

Перадавымі падпісчыкамі на заводах сярод усёй рабочай моладзі зьяўляліся комсамольцы-актывістыя, якія праводзілі вялікую растлумачальную працу і паказвалі прыклад у падпісцы на пазыку.

Так, напрыклад, комсамольцы заводу **«Восход»** прымалі актыўны ўдзел у працы камісіі садзейнічаньня рэалізацыі пазыкі.

Сакратар комсамольскай ячэйкі заводу „Энэргія“ тав. **Гуманаў** правёў вялікую працу па ахопу ўсёй моладзі заводу падпіскай на пазыку.

Комсамолка **Фіцерштэйн** (канфэктная ф-ка **„Прогрэс“**) падпісалася на 115 процантаў свайго заробку.

На 210 проц. свайго месячнага заробку падпісаўся комсамолец **Елянковіч**, вучань вадаправоднага цэху „Эльводу“.

Таксама трэба адзначыць т. т. **Гутмана** („Беларусь“), **Шыфрын** („Чырвоная Зара“) і **Дунэр** («Прогрэс»), якія значнымі адлічэньнямі ад свайго заробку ўнесьлі сваю долю ў справу індустрыялізацыі краіны.

Падводзячы некаторыя вынікі кампаніі, трэба сказаць, што рабочая моладзь добра ўцяміла сабе мэту пазыкі і пайшла насустрач Савецкаму ўраду ў яе распаўсюджваньні.

Лявінскі.

ГОСЬЦЬ З АПАРАТАМ.

Цёмна. Гудзе сівер. Комсамолец **Хведаровіч** дарэмна хутаўся ў свой падбіты ветрам кажух. Вецер кідаў у твар сьнежны пыл і западаў ва ўсе дзіркі яго драненькай вопраткі...

Дзядзька **Парэмскі**, які вёз **Хведаровіча** са станцыі ў вёску **Мужанку**, сядзеў у перадку, курыў вялікую люльку, набітую простай махоркай-самасейкай („6 капеек вагон—і самому таптаць“) і што хвіліну пагляддаў на кола, якое было, напэўна, ня мазана з часоў японскай вайны і цягнула нудную песьню ў тон ветру.

Сумнавата. На узгорку відаць, як зьбягаюць у дол некалькі хат. Вёска **Лошніца.** Мільгацеюць у вокнах прыветныя аганькі, заклікаюць да адпачынку.

Але не. Трэба ехаць міма. Комсамолец **Хведаровіч** у гэтым годзе скончыў курсы кіно-мэханікаў і зараз накіраваны з кіно-апаратам у вёску.

Першы сэанс у **Мужанцы**. Там чакаюць.

Паволі едзе фурман... Пад сьпевы колаў **Хведаровіч** заснуў...

. . . .

Раптам схапянуўся. Адчатонны мотыў ветру прарэзалі нечыя галасы. Агляпнуўся назад.

— Стой, стой!—крычалі яму.

— «Бандыты»,—прасьлізнула ў галаве жудасная думка.—„Эх, чаму я не паслухаўся таварыша і ня ўзяў нагана“...

— Дзядзька, паганяй да **Мужанкі!**

Але не ўцячэш. Тыя, хто наганяюць, ужо блізка. Абкружылі. Каня—за вобраць. Старшы сказаў:

— Э, браток, што-ж гэта ты нас мінаеш!.. Ці-ж мы ня людзі? І мы кіну хочаць пабачыць. Эй, дзядзька, заварочвай!..

Гэта былі сяляне з вёскі **Лошніца**. Яны патрабалі, каб кіно-мэханік заехаў да іх і наладзіў кіно-сэанс. Дарэмна **Хведаровіч** даводзіў, што ён ня можа, што яму трэба быць у другім месцы... У каня неяк адразу знайшлася прыткасьць і праз хвіліну ўся кампанія ўехала ў вёску. Застанавіліся перад хатай з надпісам „Нардом“.

Апарат унесьлі ў хату. А там ужо было поўна народу. Кіно-мэханіка спаткалі ветла, пасадзілі абагрэцца каля печкі.

Жонка загадчыка нардому смажыла яешню і **Хведаровіча** прымусілі тут-жа, пасярод залі, „зьнішчыць“ яе без астачы.

— Ну, а цяпер, братка, паказвай свае карціны. Пад'еўшы—і праца спарней пойдзе...

Прыладзіўшыся, даўшы хлапцам круціць дынамо, **Хведаровіч** пусьціў карціну.

На экране паказаўся раней адзін селянін. Хаваючыся, ён закопваў грошы ў зямлю пад яблыняй. А з-за плоту сачылі за гэтым зладзеі. І як толькі селянін адышоў, яны падбеглі і выкапалі грошы.

Пасьля гэтага паказаўся другі селянін. Ён прышоў у ашчадную касу і здаў свае грошы ў належнае месца.

У выніку—адзін плача, а другі—скача.

Карціна скончана. Але ўсе сядзяць, як зачараваныя. Потым загаманілі разам:

— А бадай яго!.. Ну і карціна... Дальбог, як наш Ігналь—гэта-ж ён таксама схаваў грошы ў нуню, а іх нехта «пазычыў»...

— Э, браткі, я не такі дурны. У мяне ўсе грошы на кніжачцы. У мяне не ўкрадзеш... А ты, цётка, беражыся—і табе так будзе. Ты-ж гэта грошы ў кубельчык складаеш...

— Доўга яшчэ гаварылі. Неахвотна разыходзіліся.

Хведаровіч склаў апарат і даў аднаму старому селяніну, каб ён напісаў одгук аб карціне. Дзед доўга выводзіў літары і нарэшце напісаў:

„Ведаю я, што гэта туман. Бога вы не баіцеся. Гэта чорт вас прыслаў. Але прыедзьце да нас яшчэ раз“.

Уся вёска праводзіла кіно-мэханіка за ваколіцу.

Фурманка зноў завяла песьню нямазаных колаў...

* * *

Год таму назад Белдзяржкіно організавала курсы кіно-мэханікаў, на якія было прынята 25 сялянскіх хлапцоў-комсамольцаў.

Па сканчэньні курсаў усе 25 разьехаліся з кіно-перасоўкамі па вёсках.


Праз некаторы час курсы выпусьцілі яшчэ 25 чалавек, і зараз, на абшарах Беларусі, працуе **50 вясковых кіно-мэханікаў.**

Яны робяць вялікую справу. За апошні год кіно-мэханікі абслужылі кіно-сэансамі каля **650 тысяч чалавек вясковага насельніцтва.**

Але яны ня толькі кіно-мэханікі. Прыходзіцца адначасна праводзіць вялікую культпрацу: праводзіць з сялянамі гутаркі на розныя тэмы (аб кіно, сельска-гаспадарчым падатку, сялянскай пазыцы), наладжваць голасныя чытанкі і інш.

І недарма ў Белдзяржкіно дасылаюцца сотні водгукаў аб працы кіно-перасовак—хваляць усе. Просяць прыехаць ізноў.

Э. Блакітны.



Слухай, 1906 год!

1-га сьнежня пачынаецца дапрызыўная падрыхтоўка.

1-га сьнежня ў Менскай акрузе пачынаецца **дапрызыўная падрыхтоўка моладзі 1906 году нараджэньня.**

Да абучэньня прыцягваюцца ўсе асобы 1906 году нараджэньня, як праходзіўшыя ў мінулым годзе дапрызыўную падрыхтоўку, так і непраходзіўшыя яе.

Для праходзіўшых ужо дапрызыўную падрыхтоўку тэрмін навучаньня ўстанаўліваецца ў 24 навучальныя дні, для ўсіх астатніх дапрызыўнікаў—у 32 дні.

Дапрызыўная падрыхтоўка будзе праводзіцца ва ўсёй акрузе **за выключэньнем Грэскага і Капыльскага раёнаў.** у якіх падрыхтоўка будзе праходзіць у другую чаргу, пачынаючы з 13 студзеня 1928 году.

Усяго па Меншчыне будзе існаваць да 36 дапрызыўных пунктаў. Пункты організуюцца з разьлікам, каб кожны з іх знаходзіўся на адлегласьці ня больш 10—12 вёрст ад месца жыцьця дапрызыўніка.

Усе дапрызыўныя пункты забясьпечаны належнымі памяшканьнямі і абсталяваньнем. З мясцовых бюджэтаў за першае паўгодзьдзе 1927 г. на гэта асыгнавана 19.002 рублі.

Пры ўсіх пунктах маюцца інтэрнаты і будзе організавана катлавое харчаваньне дапрызыўнікаў.

У гэтым годзе **харчаваньне ўсіх дапрызыўнікаў**, за выключэньнем тых, хто захоўвае за сабою пэнсію на прадпрыемствах, **будзе вытварацца цалкам за кошт дзяржавы.**

Акрваенкоматам зьвернута вялікая ўвага на забясьпечаньне ўсіх дапрызыўных пунктаў кіраўнічым камандным і палітычным складам.

На ўсіх дапрызыўных пунктах прыступлена да абсталяваньня Ленінскіх кутков, бібліотэк і чытальняў.



Комсамольцы чырвонаармейскай казармы.

З вайсковай партконфэрэнцыі

(Гутарка з інструктарам політкіраўніцтва БВА па комсамольскай працы і сябрам ЦК ЛКСМБ тав. Івановым).

Комсамольская організацыя Беларускай Вайсковай Акругі **верна ленінскім прынцыпам.** Гэта падцьвярджаецца тым, што яна адзінадушна асудзіла раскольніцкую дзейнасьць опозіцыйнага блёку.

Комсамол Акругі зьяўляецца **рэзэрвам парторганізацыі.** 80 проц. усіх прымаемых у партыю чырвонаармейцаў прыпадае на комсамольцаў. Партасяродак у комсамольскай організацыі складае 25 проц. агульнага складу.



Тав. Іваноў.

Рост нашай комсамольскай організацыі ідзе ў асноўным, **за лік лепшай часткі чырвонаармейцаў.** Павялічваецца яе пролетарскі асяродак.

За апошні час у нас былі выпадкі добраахвотных выхадаў з комсамолу на глебе нездаволеньня саюзнай працай. Гэта высоўвае задачу **прыстасоўваньня форм і мэтадаў комсамольскай працы ў арміі да запатрабаваньняў нашых комсамольцаў.**

З новых форм і мэтадаў работы грамадзянскага комсамолу мы зможам **узяць тое, што магчыма ўжываць у нашых чырвонаармейскіх умовах.** Конкрэтна мы разумеем гэта, як усямернае ажыўленьне дзейнасьці комсамольцаў у існуючых грамадзкіх, самадзейных і па за школьных організацыях і **павышэньне адказнасьці комсамольцаў за працу ў іх.**

Пасьпяховае правядзеньне гэтай працы ўпаўне забясьпечана з прычыны добрага падбору кіраўнічага складу (актыў комсамольскіх груп). У складзе нізавых організатараў комсамольскіх груп і ў палкавых бюро мы маем дастатковую партыйную праслойку (71 проц.).

Комсамольская організацыя Акругі—**спаяна.** Гэтаму садзейнічае тое, што комсамольцы-чырвонаармейцы аб'яднаны ў сваім штодзенным жыцьці аднымі задачамі вайскова-політычнай вучобы. Жывучы заўсёды разам, комсамольцы-чырвонаармейцы маюць магчымасьць большага кантролю над сваімі паводзінамі, як у вучобе так і ў быце.

Таксама нашу асноўную задачу—**узмацненьне дысцыпліны**—мы вырашаем досыць пасьпяхова. Мы ўжо зараз змаглі дабіцца такога становішча, **калі комсамольцы ў пытаньнях дысцыпліны стаяць вышэй беспартыйных на цэлую галаву.** Аднак, гэта ня зьнімае з нас абавязку далейшага правядзеньня працы ў гэтым напрамку, каб зрабіць з кожнага комсамольца-чырвонаармейца **організатара дысцыпліны.**

Організацыя зьвяртае вялікую ўвагу на пытаньні **вайскова-політычнай вучобы!** У сэнсе **баявой падрыхтоўкі** комсамольцы ідуць значна ўперадзе беспартыйных чырвонаармейцаў. У стрэльбах пападаньне комсамольцаў вышэй беспартыйных у сярэднім на 10 проц.

Яшчэ адна сур'ёзная задача высоўваецца зараз у цэнтр нашай увагі, гэта—**неабходнасьць павялічэньня ўвагі комсамольскіх груп да барацьбы за культурную казарму.** Комсамольцы-чырвонаармейцы павінны даваць прыклады здаровага быту (чыстка зубоў, акуратнасьць, чыстата ў ленкутку, у казарме і г. д.). Дзе-ні-дзе групы ўжо такую работу праводзілі і яна давала бязумоўныя посьпехі.

З 8-га ўсебеларускага зьезду ЛКСМ—**сувязь паміж армейскай і грамадзянскай часткай комсамолу ўстанавілася самап цесная.** Нашы політорганы ў пытаньнях комсамольскай працы цесна зьвязаны **з мясцовымі комсамольскімі камітэтамі.** Апошнія аказвалі політорганам вялізарную дапамогу ў кіраўніцтве КГСП (комсамольскімі групамі садзейнічаньня партыі).

Аднак, трэба паказаць адно слабое месца ў працы па сувязі. Яно заключаецца ў тым, што мясцовыя комсамольскія камітэты яшчэ да гэтага часу не праводзяць сыстэматычнай працы па азнаямленьні чырвонаармейцаў-комсамольцаў з жыцьцём і працай грамадзянскіх комсамольскіх ячэек.

На хвалі 1155 мэтраў.

(Менская радыё-станцыя імя Савнаркому БССР.).

Сёньня перадаецца наступная програма: 6 ч. 00 хв. гутарка—**„Друк і соцыялістычнае будаўніцтва“**; 6. 30 — **Радыё-газэта № 191**; 7. 00.—Гутарка **„Нашы вучоныя і абарона краіны“**; 7. 40.—**„Радыё-газэта на мове эспэранто“**; 8. 10.—**Концэрт.**

Заўтра перадаецца: 6. 00 — **Гутарка ўрача**; 6. 30. **Радыё-газэта № 192**; 7. 10. — Даклад ЦП саюзу сельска-гаспадачых і лясных рабочых—**„Аб парадку правядзеньня разрахунковай кампаніі батрацтва з прадпрыемцамі“**.; 7.40.—Даклад Інбелкульту—**„Рэорганізацыя Інбелкульту“**; 8. 10.—**Концэрт.**

Куды пайсьці?

Сёньня ў Менскіх кіно-тэатрах пачынаюць дэмонстравацца наступныя кіно-фільмы: „Інтэрнацыянал“—фільм з удзелам Ліліан Гіш—**«Дзьве Сіроткі»**; „Культура“—вялікі баявік па п'есе Луначарскага — **„Яд“**; „Пролетары“—**„Поэта і цар“**; „Чырвоная Зорка“—**„Кацярына Ізмайлава“** (па роману Ляскова—„Леди Макбет Мценскаго уезда“)

Адказы чытачом.

П. Мэйлаху (№ 1248). Сваю працу на новай антэне Менская радыё-станцыя распачала. Яе хваля—1155 мэтраў.

К. Сьмірнову (№ 1245). XI зьезд КП(б)Б адбудзецца ў Менску ў сьнежні гэтага году.

Адказныя рэдактары: А. КУРЦІК. А. БАРАНЬНІКАЎ.